

Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Пейджинговую связь редакции обеспечивает НП ООО "Защита-Сервис". ТЕЛЕФОН В Г.ГРОДНО (8-22)-75-00-66, В Г.СЛОНИМЕ 2-64-44.

Газета Слонімская

№21 (207). 24 — 30 траўня 2001г. Масава-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 130 руб.

УСЁ ДАРАЖЭЕ – МАЛАКО ТАННЕЕ

Рашэннем аблвыканкама з першага траўня бягучага года па ўсёй Гродзенскай вобласці ўстаноўлена адзіная закупачная цана на малако. Цяпер за адзін літр малака сярэдняй тлустасці малаказаводы будуць плаціць калгасам і прыватным гаспадарам 110 рублёў, раней плацілі па 129 рублёў. Пры гэтым кошт бутэлькі малака ў краме (0,5 л) не знізіўся і складае 179 рублёў. На рынку ж малако прадаюць па 200 рублёў за літр.

У тэлефоннай размове з карэспандэнтам "ГС" дырэктар Слонімскага завода сухога і абястлушчанага малака Міхаіл Дмухоўскі сказаў, што іх прадпрыемства да гэтага паніжэння закупачнай цаны на малако не мае ніякага дачынення, яны толькі выконваюць рашэнне аблвыканкама.

Тыя бабулі-пенсіянеркі, якія часам з апошняга высільваюцца, трымаючы на вёсцы карову, ніяк не могуць узяць у толк: чаму, калі ўсё даражэе, за здадзены літр малака ім сталі плаціць менш грошай? Пры гэтым людзі ўспамінаюць ранейшыя часы, калі кошт здадзенага дзяржаве літра малака прыраўніваўся да кошту буханкі хлеба. З якіх жа меркаванняў улады ўстанавілі цэны на малако зараз – не зразумела.

Мікола КАНАНОВІЧ



Фота Віталя Гіля

ДЕЙСТВИТЕЛЬНО, ХВАТИТ БАЛОВАТЬСЯ

Выступая на втором Всебелорусском народном собрании, Александр Лукашенко потребовал от коммунальных служб страны, чтобы в текущем году период отключения горячей воды не превышал 10–14 дней.

"Это мое жесточайшее требование ко всем руководителям", – заявил глава государства. "Ищите деньги и отключайте воду для того, чтобы водопровод починить, максимум на 10 дней, ну, максимум на 14 дней. И хватит баловаться и обманывать народ", – сказал Лукашенко.

Надеемся, что эти требования услышали, приняли к сведению и слонимские руководители города.

Наталья ФУРСОВА

ПРОГНОЗ ПОГОДЫ
по Гродненской ОБЛАСТИ

22-23 МАЯ Переменная облачность, без осадков, ветер западный, 3-8 м\с, ночью заморозки: 0-3, днем +13 +18.

24-25 МАЯ Переменная облачность, местами кратковременные дожди, ветер юго-западный с переходом на северо-западный 5-10 м\с, 25 мая порывы до 14 м\с. Температура воздуха ночью +3 +8, днем 24 мая +15+20, 25 мая +10+15



И ВНОВЬ ПОВЕДУТ В МИР МИРАЖЕЙ

Приятная новость: все 22 делегата, которые представляли на втором Всебелорусском народном собрании землю слонимскую, получили в дар по телевизору.

Эти телеприёмники марки "Верас" еще в прошлый понедельник были доставлены из Гродно в Слоним законным владельцам. Так что, отправляясь в Минск на исторический для страны форум, наши посланники уже успели оценить качество картинки новой техники. Да и везли делегатов в столицу на вновь оборудованном автобусе. Для создания комфортабельности в салоне местный автобусный парк №11 выделил почти 500.000 рублей.

Поэтому предложенную Александром Лукашенко Программу социально-экономического развития Республики Беларусь на 2001–2005 годы наши делегаты активно поддержали. А это значит, что реализация намеченной программы "обеспечит дальнейший экономический рост, эффективное функционирование экономики, существенное повышение жизненного уровня белорусского народа".

Так что скоро заживем по-богатому. Ведь участники собрания, в том числе и слонимские, уверенно взяли на себя ответственность за воплощение в жизнь этих решений. И обязались вместе с президентом довести к концу 2005 года среднюю зарплату до 250 американских долларов. Просто нужно еще потерпеть, пострадать каких-то четыре несчастных года – и будет у нас зарплата, как сегодня у литовца.

А сейчас на государство не стоит надеяться, сказал Лукашенко и отметил, что "семью должны кормить родители". Где и как будут они добывать хлеб насущный, президент не пояснил. Он и так для нас много сделал: запустил заводы и фабрики, сохранил колхозы, жилье строится по плану, войны нет... В общем, что ещё надо? Ах да, остается выбрать Лукашенко президентом еще на пять лет.

"Я не хочу удерживать власть силой и несправедливостью", – заявил президент на собрании. "Если мы сломаем общество, если мы не убедим общество, что оно должно поддержать нас на этом переломном этапе, если в результате этого убеждения люди за нас не проголосуют, а мы их просто сломаем, мы никогда не удержим власть", – сказал Лукашенко.

Короче, начинается период тотальных убеждений в том, что лучше нас никто не живет. И если власть останется в прежнем составе, заживем еще лучше. А для этого каждый делегат второго Всебелорусского народного собрания должен провести встречи с трудовыми коллективами на той территории, где его выдвигали.

Анатолий МИРСКИЙ

ТРИБУНА

Опрос по телефону

Не за горами время выпускных экзаменов в школе.

В связи с этим событием родители собирают деньги, чтобы купить учителям подарки, оплатить ремонт кабинетов, устроить своим детям выпускные вечера и т.д. В разных школах Слонима эта цена колеблется от 5 до 20 и более тысяч рублей.

"ГС" интересует мнение родителей и детей, как они относятся к тому, что выпускные классы должны собирать деньги, чтобы отремонтировать кабинеты? Согласны ли они с этим?

Все желающие высказаться на эту тему могут позвонить по телефону 2-14-39 (Ольга Шинкевич) или ответить на пейджер по телефону 8-22-73-00-00 для абонента 95196. (По желанию участников опроса их имена газета указывать не будет).

ЕЩЕ НА НЕДЕЛЮ В РУБРИКЕ "ПО СЕКРЕТУ ВСЕМУ СВЕТУ" ОСТАЕТСЯ ПРЕЖНИЙ ВОПРОС: "КАКОЙ САМЫЙ НЕОЖИДАННЫЙ ПОДАРОК В СВОЕЙ ЖИЗНИ ВЫ ПОЛУЧИЛИ?" СВОИ ОТВЕТЫ ПРИСЫЛАЙТЕ ПО ТЕЛЕФОНУ 8-22-73-00-00 ДЛЯ АБОНЕНТА 95196.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ІНТЭРВ'Ю



Ірына Шпыркова: "НАШ СЛОНІМ МОЖНА ЗРАБІЦЬ ГОРАДАМ-МУЗЕЕМ"

На мінулым тыдні ўся музейная грамадскасць традыцыйна адсвяткавала Міжнародны дзень музеяў. Пачатак гэтаму святу быў пакладзены яшчэ ў 1977 годзе на 12-й Генеральнай асамблеі ІКОМ.

Пра справы і дзейнасць Слонімскага раённага краязнаўчага музея расказвае яго дырэктар Ірына Шпыркова.

– Ірына Рыгораўна, што сабой сёння ўяўляе Слонімскі раённы краязнаўчы музей?

– Найперш, ён краязнаўчы. Гэта значыць, што ў ім прадстаўлены прырода і гісторыя нашай Слонімшчыны.

На першым паверсе музея тры залы прыроды, якія распавядаюць аб насельніках ледніковай фауны краю, яго ландшафце, сучасным жывёльным, раслінным свеце, карысных выкапнях. Лічу, што аддзел прыроды вельмі цікавы.

Месціцца на першым паверсе і самы старажытны аддзел, пачынаючы ад першабытнага чалавека і заканчваючы Першай сусветнай вайной. Асабліва заслугоўваюць увагі экспанаты, звязаныя з Львом Сапегам, Міхалам Агінскім, Тадэвушам Касцюшкам, Кастусём Каліноўскім і вайной 1812 года.

На другім паверсе адзін пакой музея прысвечаны побыту нашых сялян, другі – жыццю Слоніма з 1920 па 1939 гады, калі наш горад быў пад Польшчай. Два залы музея аддадзены гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. І, нарэшце, адна невялікая зала расказвае пра сучаснае жыццё Слонімшчыны. Тут культура, асвета і прамысловасць. Бяда ў тым, што плошча музея не дазваляе ўсяго паказаць. Цесна нам тут. Музей багаты на экспанаты, іх налічваецца больш за 21 тысячу адзінак, а вось плошчы бракуе.

(Працяг на 9 стр.)

НАВІНЫ

У СЛОНІМЕ РАСЦЕ БЕСПРАЦОЎЕ

Цяпер у Слонімскай дзяржаўнай службе занятасці зарэгістравана 927 беспрацоўных.

У параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года гэта на 9,1% больш.

Сярэдні памер дапамогі беспрацоўнаму складае сёння 6.014 рублёў у месяц (4,5$).

БОЛЬШ ПАМІРАЮЦЬ ВЯСКОЎЦЫ

За першы квартал бягучага года на Слонімшчыне нарадзіліся 143 немаўляткі, а памерлі — 271 чалавек.

У горадзе з'явіліся на свет 108, у вёсцы — 35. Пакінулі гэты свет у Слоніме 114 гараджан, у сельскай мясцовасці — 157 вяскоўцаў.

Сяргей ЧЫГРЫН

БОСАЯ ТРАДЫЦЫЯ

Ужо болей як пяць гадоў пацыенткі мастоўскай жаночай кансультацыі ходзяць у памяшканні басанож.

Гэтая традыцыя была ўведзена, як толькі ў калідоры была паслана новая дыванная дарожка. З цягам часу дыванновае пакрыццё састарэла, але традыцыя разбуваць жанчын засталася.

Антон МАКЕЙ

У МАСТАХ ГАРАЧУЮ ВАДУ ДАЮЦЬ, КАЛІ СЦЯМНЕЕ

Мастоўскія камунальныя службы змянілі графік падачы гарачай вады гараджанам.

Калі ў мінулыя гады цёплая вада не падавалася ўлетку ўвогуле ці толькі па выхадных днях, то зараз яна ёсць штодня вечарам. У іншыя часы сутак з "гарачага" крана вада не цячэ ўвогуле.

Антон МАКЕЙ



Топлива вроде бы хватило, теперь не хватает дождя

Фота Віталя Гіля

По сообщению агентства "Прима", закупка российской нефти Беларусью в мае может сократиться, так как цены на нее возрастут до 121 доллара США за тонну, что на 5-6 долларов больше цены в апреле. В этом случае финансовое положение концерна Белнефтехим не позволит закупать нефть в достаточном количестве. Уже к концу апреля потребители нефтепродуктов в Беларуси задолжали концерну более 16 миллиардов рублей.

В сложившейся ситуации оказалось и Слонимское предприятие по обеспечению нефтепродуктами. 70% потребителей по Слонимскому району — предприятия промышленного комплекса и, по словам директора нефтебазы Михаила Соловья, выполнение призыва президента А. Лукашенко выделять сельскому хозяйству нефтепродукты подешевле привело к убыткам в 31 миллион рублей только за первый квартал текущего года.

— Думали поправить дела в апреле, — рассказывает Михаил Павлович, — но ничего не удалось. Агропрому дали максимально по фиксированным ценам, в виде товарного кредита и гуманитарной помощи. Дополнительно получили еще часть убытков на сумму 7 миллионов рублей. В результате, на сегодняшний день (18 мая) дебиторская задолженность составляет 38 миллионов рублей.

И реального выхода из создавшегося положения пока не видно. Платежеспособность колхозов и совхозов низкая. У них нет пока и продукции, чтобы начать расплачиваться по счетам.

Тем не менее, посевная кампания прошла практически без задержек в плане снабжения ГСМ. А всего до конца мая колхозам, совхозам и иным крестьянским хозяйствам будет выделено (по РБ) 40 тысяч тонн дизельного топлива и 10 тысяч тонн автомобильного бензина по ценам соответственно 416635 рублей и 528034 рубля за тонну.

Возместить стоимость выделенных объемов топлива предполагается до декабря 2001 года по ценам, которые будут действовать на момент возврата.

— По команде госрезерва, — продолжает Михаил Соловей, — мы выделили уже 75% от намеченных объемов поставок ГСМ агропрому. 25% оставляем на "зеленое жниво". А уж там, может быть, как колхозы начнут сдавать скот, появятся деньги, которыми они покроют убытки.

Будем ждать осени, хорошего урожая. Вот только погода вредит и в сельском хозяйстве уже есть потери. Нужен дождь, затяжной трехдневный дождь, — заканчивает Михаил Павлович.

Дождь, действительно, нужен. Но не подвластна природа человеку, и остается лишь на Бога уповать... А дожди, вообще-то, давно уже идут - настоящие информационные ливни на БТ, основательно промывающие мозги людям. Последний их них пролился 18 мая с трибуны II Всебелорусского народного собрания. Только ведь сельскому хозяйству он вряд ли поможет. Да и топлива от словоблудия больше не станет, а, значит, и зерна по 50 центнеров с гектара собрать будет сложно.

Валерий КОВАЛЕНКО

ПОШТА

Свята па разнарадцы

13.05., у нядзелю, класны кіраўнік сказала нам, каб мы прыйшлі ў РДК на свята сцяга і герба. Я не ўспрымаю "новы" герб і сцяг і таму не пайшоў на гэтае мерапрыемства.

У панядзелак класны кіраўнік сказала, каб усе, хто не быў на мерапрыемстве, напісалі "объяснительную".

Я хачу спытаць, ці мае яна права прымусіць мяне напісаць гэтую "объяснительную"?

АД РЭДАКЦЫІ:

Шаноўны С. (з-за магчымых непрыемнасцей вучань прасіў не называць яго імя -рэд.), нядзеля з'яўляецца выхадным днём, і ты маеш права сам ці з бацькамі выбіраць мерапрыемствы, якія б ты хацеў наведаць. Гэта можа быць паход у музей ці ў кіно, паездка на рыбалку, гульня з сябрамі ў футбол і г.д. І калі ў гэты дзень ты не здзейсніў ніякіх правапраўных дзеянняў, то ніхто не мае права патрабаваць ад цябе пісаць тлумачальную запіску.

НАВІНЫ

ПИКЕТ ПРОТИВ ЗАДЕРЖЕК ЗАРПЛАТЫ

21 мая, несмотря на дождь, около 60 сотрудников унитарного предприятия "Медик" провели в Гродно санкционированный пикет против многократных задержек заработной платы.

По словам инициатора пикета — инженера-наладчика предприятия Михаила Ещика, начиная с января месячный заработок работникам предприятия выплачивается в три приема, по мере поступления денег. Ещик просил разрешить ему пикетирование областного управления здравоохранения, находящегося в здании облисполкома, однако местные власти перенесли место пикета на улицу Социалистическую, к главному зданию УП "Медик". Пикетчики растянулись живой цепью приблизительно метров на сорок. В руках они держали плакаты: "Май! Труд! А где зарплата?", "Наши дети хотят кушать. Каждый день", "Хачу працаваць за грошы" и другие.

Павел МОЖЕЙКО

ПРЫЁМ ГРАМАДЗЯН У СЛОНІМСКІМ РАЙВЫКАНКАМЕ

22 траўня ў Слонімскім райвыканкаме правялі прыём грамадзян старшыня Слонімскага райвыканкама Мікалай Пахолак і начальнік упраўлення Камітэта дзяржаўнага кантролю па Гродзенскай вобласці Васіль Снітко.

На прыём па асабістых пытаннях і праблемах прыходзілі не толькі вяскоўцы, але і гараджане. Чатыры гадзіны праходзіла сустрэча. Па многіх пытаннях слонімцы адразу атрымлівалі адказы, на месцы вырашаліся тыя праблемы, якія можна было вырашыць. Напрыклад, жыхар Слоніма Андрэй Данільчык на фабрыку гасцінны мэблі аддаў распілаваць дрэва на дошкі. Але яму распілавалі не таго памеру, які ён заказваў. І малады чалавек ужо паўгода дабіваецца ад фабрыкі належнага выканання заказу. І толькі пасля гутаркі дырэктара фабрыкі Віктара Гаркавага з Васілём Снітко, пытанне гэта будзе вырашана на карысць заказчыка.

Аляксандр Зімніцкі з Дзераўной скардзіўся, што ў яго вёсцы насупраць аптэкі створаны адстойнік бруду. А сланімчанку Ванду Ахраловіч хвалюе, чаму ў Жыровічах са жніўня мінулага года не працуе млын, дзе раней малолі зерне не толькі вяскоўцы, але і гараджане. З гэтым пытаннем паабяцаў разабрацца старшыня райвыканкама.

У Ганны Міхайлаўны Лішык з вёскі Навасёлкі восем дарослых дзяцей, муж — інвалід. Дзеці жывуць у розных кутках Беларусі. Восем гадоў яна стаіць у чарзе на ўстаноўку тэлефона, але яго так і не ўстанавілі. На сустрэчы Ганне Міхайлаўне паабяцалі ўстанавіць тэлефон у наступным годзе.

Некалькі чалавек, якія завіталі да Аляксандра Пахолкі і Васіля Снітко, пыталіся, чаму ў іх вёскі не курсіруюць аўтобусы. Аляксей Саванец крыўдзіўся, што ў яго вёску Ніз аўтобусы ходзяць толькі два разы на тыдзень, па выхадных днях. Ён сабраў дзвесце подпісаў ад жыхароў сваёй і суседніх вёсак з просьбай вырашыць гэтае пытанне. На сустрэчу была запрошана намеснік дырэктара па перавозках Слонімскага аўтапарка №3 Валянціна Жук, якая сказала, што раней у дзень было на Слонімшчыне 250 маршрутаў, а цяпер у выхадныя засталося 90. Аўтапарк не мае сродкаў, таму дадаткова па буднях у Нізы аўтобус курсіраваць не будзе.

Спадар Саванец застаўся незадаволены.

На прыём у райвыканкам прыйшло некалькі жыхароў дома №26 з вуліцы 1 Сямігодкі. У 1991 годзе яны засяліліся ў 64-кватэрны дом, а праз два гады ў іх доме пацёк дах. Вось і ходзяць людзі па ўсіх інстанцыях, просяць, каб у іх доме зрабілі рамонт. На сустрэчы ім усё ж паабяцалі, што сёлета летам дах адрамантуюць.

На сустрэчу са старшынёй Слонімскага райвыканкама Мікалаем Пахолкам і з начальнікам упраўлення Камітэта дзяржкантролю па Гродзенскай вобласці Васілём Снітко прыходзілі людзі і з іншымі пытаннямі: чаму ў Жыровічах не працуе лазня, чаму старшыня калгаса імя Суворава "адрэзаў" соткі ў жыхароў вёскі Гуменікі і г.д.?

Вядома, усіх пытанняў і праблем адразу не вырашылі. Але такія сустрэчы вельмі карысныя і неабходныя. Як простым людзям, так і начальнікам. Бо жыццё сёння вельмі складанае, таму праблем прыбаўляецца і прыбаўляецца.

Сяргей ЧЫГРЫН



Фота Віталя Гіля

Старшыня Слонімскага райвыканкама Мікалай Пахолак (справа) і начальнік упраўлення Камітэта дзяржкантролю па Гродзенскай вобласці Васіль Снітко (у цэнтры) вядуць прыём грамадзян

ЗДАРЭННІ

Выяўлены труп

На вуліцы Шасейнай у Слоніме выяўлены труп мужчыны з нажавымі ранамі.

Узбуджана крымінальная справа.

Гарэла кватэра

З-за неасцярожнага абыходжання з агнём загарэлася кватэра на вуліцы Яршова ў Слоніме.

У агні згарэла мэбля.

На заводзе ўкралі алюміній...

На цагляным заводзе, што ў Пятралевічах пабывалі злодзеі.

Яны ўкралі алюмініевую форму для вырабу цэглы.


...а ў жанчыны — віно

Пакуль адна жыхарка з вёскі Акачы Слонімскага раёна адпачывала ў санаторыі, з яе хаты злодзеі ўкралі 10 бутэлек гарэлкі і віна.

Вядзецца праверка.

Сяргей ЧЫГРЫН

БЕСПРЕДЕЛ
на польской границе


Фото IREX/Promedia

В редакцию "Газеты Слонімскай" обратился слонимец Алексей Петрович К., который рассказал вот что:

"Я со своими друзьями занимаюсь перегоном машин из Германии в Беларусь. Назад домой нам нужно ехать через польскую границу, переход Швеско. Так вот там, после прохождения пограничного контроля, таможенники сначала отбирают у нас паспорта. Потом мы должны ехать на грузовой терминал, где оформляют документы на машины. На этот терминал нас сопровождает так называемый конвой из двух человек. Причем, этот конвой принудительный, без него никак нельзя самим ехать на терминал. С каждого хозяина машины они берут по 130 долларов за "услуги" конвоирования. Собирают для сопровождения по 6-7 машин, а в день они "провожают" на терминал примерно 100 машин. И вот посчитайте, сколько денег имеет в день польский принудительный конвой.

Никаких квитанций нам не выписывают. Причем, конвой едет без оружия, так что, если на машины по дороге нападут бандиты, никто нас не сможет защитить.

Я рассказываю все это для того, чтобы люди, которые собираются заниматься перегоном машин, знали про это нововведение польских пограничников. Причем, все знают, что это конвоирование незаконно. Просто как-то нас по дороге в терминал остановили польские полицейские. Они были очень удивлены, почему это все документы находятся у конвоя, и почему с нас берут такие деньги."

Записала
Ольга ШИНКЕВИЧ

P.S. Корреспондент "ГС" обратилась по телефону 8-029-66-88888 к юристу, который рассматривает жалобы людей, пострадавших от произвола польской пограничной службы. Дмитрий Михайлович рассказал, что такие жалобы многочисленны. Но пострадавшие люди зачастую не хотят обращаться за помощью, так как они не верят в возвращение потерянных денег. Дмитрий Михайлович предложил изложить свои жалобы в письменном виде и отослать ему по адресу: 220000, г. Минск, ул. К. Маркса, 8-98.

ЗДАРЭННІ

Граната ў слонімскім парку

Невядомая асоба пазваніла ў дзяжурную часць Слонімскага райаддзела міліцыі і паведаміла, што ў парку ляжыць баявая граната.

Следча-аператыўная група выехала на месца і, сапраўды, пад адной з лавак знайшла гранату Ф-1 і запал да яе.

Затрыманы з відэамагнітафонам

З інтэрната №6, што на Брэсцкай вуліцы ў Слоніме, зніклі відэамагнітафон і касеты.

Маладому слонімцу не ўдалося нават праглядзець усе касеты, як ён быў затрыманы міліцыяй.

Для каго патроны?

У аднаго з жыхароў г. Слоніма выяўлена 14 патронаў да пісталета Макарава.

Узбуджана крымінальная справа.

Знікла сетка

У жыхара Рышчыц з надворка знік рулон сеткі.

Раней судзімы злодзей затрыманы, хоць ён паспеў ужо збыць крадзенае.

Сергей ЧЫГРЫН

Смерць на рабочым месцы

Днямі на сваім рабочым месцы памёр работнік ААТ "Мастоўдрэў".

54-гадоваму мужчыне нечакана стала кепска. На жаль, уратаваць медыкі яго ўжо не змаглі.

Антон МАКЕЙ

ІНТЭРВ'Ю

ДЗЕ НАМ ЛЕТАМ АДПАЧЫЦЬ?



Хутка наступіць лета — пара адпачынкаў і канікул. Сёння на пытанні карэспандэнта "ГС" адказвае дырэктар Слонімскага бюро падарожжаў і экскурсій Алена Кедала.

— Алена Альбінаўна, што цяпер можна прапанаваць людзям для адпачынку?

— Як слонімцы, так і госці могуць у нас набыць пуцёўкі для адпачынку на беларускіх базах (на Нарачы і Браслаўскіх азёрах) і на Украіне (у горадзе Ачакаў Нікалаеўскай вобласці і ў горадзе Скадоўск Херсонскай вобласці ў пансіянаце "Лазурный"), у Крыму (у Ялце, Алушце і Еўпаторыі).

— На якія месяцы можна ўжо набыць пуцёўкі?

— На ўсе летнія месяцы і на верасень. Заезды праз кожныя 15 дзён.

— Што значыць заезды?

— Групы адпачываючых фарміруюцца ў Слоніме, і мы іх адпраўляем на аўтобусах да месца. Тых, хто хоча адпачыць у Крыму, мы адпраўляем аўтобусамі з Мінска. Але ўсе дакументы афармляюцца ў нашым слонімскім бюро. На Украіну і па Беларусі адпачываючыя выязджаюць са Слоніма.

— Колькі каштуюць пуцёўкі?

— Пуцёўка на 12 дзён, напрыклад, у Ачакаў каштуе 60 даляраў (чатырохразовае харчаванне, пражыванне і лячэнне), а без лячэння — 40 даляраў. І праезд — 60 тысяч беларускіх рублёў. Дзецям да 11 гадоў ёсць скідкі. Пуцёўкі ў Крым даражэйшыя. Дарэчы, рублёвая аплата праводзіцца ў нас, а даляравая — там, дзе людзі будуць адпачываць.

— А колькі каштуюць пуцёўкі для тых, хто хоча адпачыць у Беларусі?

— Цэны амаль такія, як і паехаць на Украіну. Напрыклад, на Нарачы, з пражываннем у гасцініцы, пуцёўка каштуе дзесяці 150 даляраў.

— Ці ёсць у Вас пуцёўкі ў Балгарыю ці на Канары?

— Ёсць. У Балгарыі за 300 даляраў могуць адпачыць два чалавекі. Ёсць у нас пуцёўкі ў Турцыю, на Канары, на Кіпр. Усе жадаючыя могуць звяртацца да нас. Мы дапаможам.

— Па якіх пашпартах можна беларусам ехаць адпачываць, напрыклад, на Украіну ці ў Крым?

— Па старых пашпартах СССР, па беларускіх з "Пагоняй" і па новых беларускіх. Абавязкова пашпарты павінны быць у дзяцей любога ўзросту. У гэтыя дзяржавы візы адкрываць не трэба.

— Алена Альбінаўна, дзе і ў каго можна больш падрабязна даведацца наконт пуцёвак?

— Няхай людзі звяртаюцца ў Слонімскае бюро падарожжаў і экскурсій па адрасе: вуліца Оперная,1, тэлефон 2-44-66.

Гутарыў Сяргей ЧЫГРЫН

НАВІНЫ

ПАПРАЦАВАЛІ НА СКЛАД — І НА АДПАЧЫНАК

З 14 траўня на тры месяцы спынена праца ў мэблевым цэху ААТ "Мастоўдрэў". Паколькі прадукцыяй гэтага прадпрыемства забіты склады, яна не знаходзіць свайго спажыўца.

Гутарка аб спыненні вытворчасці вялася на працягу года. Адміністрацыя прымусіла рабочых напісаць заявы на адпачынак па ўласнаму жаданню. Нейкая частка людзей будзе працаўладкоўвацца на галоўным прадпрыемстве, хоць і там справы ідуць дрэнна.

ПАШПАРТЫЗАЦЫЯ ВЁСКІ

Даволі дзейсны метад па замене пашпартоў у сельскага насельніцтва практыкуе пашпартна-візавы аддзел Мастоўскага РАУС, які ўзначальвае Галіна Фокіна.

Каб зменшыць выдаткі вяскоўцаў на паездкі ў горад, а таксама паменшыць чэргі ў калідорах аддзела, супрацоўнікі пашпартна-візавай службы на адзін дзень робяць выезд у вызначаны сельсавет. Там, на месцы, яны афармляюць неабходныя дакументы. На мінулым тыдні падобная паездка была арганізавана ў Харціцкі сельсавет.

Антон МАКЕЙ

ШКОЛЕ СПОЎНІЛАСЯ 100 ГАДОЎ

Векавы юбілей адзначыла нядаўна Яварская сярэдняя школа, што ў Дзятлаўскім раёне.

З усіх куткоў свету з'ехаліся яе былыя вучні, каб павіншаваць удзел ва ўрачыстасці. За апошнія 50 гадоў з яе сцен выйшлі 1500 выпускнікоў, а зараз тут займаецца 101 вучань.

Мясцовы калгас "Новае жыццё" падарыў школе музычны цэнтр, а аддзел адукацыі райвыканкама - маразільную камеру для сталовай.

АЛАІЗЕ ПАШКЕВІЧ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

27 траўня ў Дзятлаўскім раённым доме культуры адбудзецца конкурс чытальнікаў, прысвечаны 125-годдзю Алаізы Пашкевіч (Цёткі).

У ім прымуць удзел прадстаўнікі ўсіх устаноў культуры раёна. Пераможцы паедуць на абласны конкурс.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ПОШТА



Жыве беларуская мова!

Днямі ў Слоніме прайшоў круглы стол на тэму "Роля маладзевых грамадскіх арганізацый Слонімшчыны ў пашырэнні сфер ужывання беларускай мовы ў паўсядзенным жыцці".

Мерапрыемства было прымеркавана да 6-ай гадавіны ганебнага рэферэндуму, які "ураўняў" правы дзвюх дзяржаўных моў. На самай справе гэтае "аднолькавае" становішча азначае не што іншае, як выцясненне мовы беларусаў з гарадскіх школ, з паўсядзённага выкарыстання. Ці роўная колькасць школ у горадзе з рускай і беларускай мовай выкладання? Не, у нас усе школы рускамоўныя. Тое ж самае і з ВНУ. Ды пра якія роўныя правы дзвюх моў можна казаць? Спачатку выкінулі з нашага жыцця роднае слова, а потым заявілі, што беларускую мову не любяць беларусы. Фарс.

На круглы стол сабраліся прадстаўнікі маладзёжнага аб'яднання "Вятрак", сябры грамадскага маладзёжнага клуба "Ветразь", экалагічнага клуба "Жаваранак", члены гуртка юных журналістаў пры клубе "Святліца" і творчая моладзь з "Ветразя надзеі". На пасяджэнне былі запрошаны сябры слонімскай суполкі Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны.

Вядучы круглага стала, кіраўнік "Ветрака" Алег Шэлестаў падкрэсліў, што асноўная мэта тых, хто сабраўся, намеціць шляхі прапаганды і адраджэння роднай мовы. На абмеркаванне былі вынесены пытанні: "Чаму грамадства не ўжывае беларускую мову ў паўсядзённым жыцці? Чаму многія лічаць беларускую мову прымітыўнай, "галімай"? Што мы можам зрабіць для таго, каб пашырыць кола ўжывання беларускай мовы?" Пасля абмеркавання ў групах, якія далі сабе сімвалічную назву "Наша будучыня", "Надзея", "Наша вера", выступаючыя падкрэслілі наступнае. Беларусы не карыстаюцца роднай мовай, бо не ведаюць яе. З боку дзяржавы робіцца ўсё, каб выхаваць да роднай мовы антыпатыю. Многія называюць беларускую мову калгаснай, вясковай, таму што вёска больш адсталая ў параўнанні з горадам, а імена туды выціснулі, выгналі беларускую мову. У нашай краіне праз СМІ ідзе прапаганда рускай мовы. На першым нацыянальным тэлеканале рэдка пачуеш роднае слова. Закрываюцца такія перадачы, як "Беларускія вячоркі", "Роднае слова", "Зорная ростань". Не прапагандуюцца беларускія "зоркі" мастацтва, пісьменнікі і паэты. У людзей выхоўваецца абыякавасць да мовы і гісторыі продкаў. Моладзь развучылася радавацца і любіць. Гэтыя святыя пачуцці замяняюцца пагоняй за матэрыяльнымі выгодамі: за моднай вопраткай, тэхнікай, за сучаснымі аўтамабілямі. Адсюль наша грамадства мае нізкую нацыянальную свядомасць. Дзяржава не выхоўвае ў насельніцтва адчування таго, што ўсе мы — адно нацыянальнае цэлае, таму ролю выхавання ўзялі на сябе апантаныя беларускасцю людзі, грамадскія арганізацыі, якія ў наш час часта праследуюцца толькі за тое, што імкнуцца адстаяць правы роднай мовы. У сям'і бацькі размаўляюць па-руску, таму маладыя людзі бяздумна карыстаюцца рускай мовай. Нават стала на Беларусі ўкаранёна думка, што гаварыць па-беларуску сорамна. Начальства цураецца роднай мовы, дае прыклад адмоўнага стаўлення да яе.

Моладзь вырашыла на гэтым пасяджэнні, што трэба пачаць з сябе — самім карыстацца роднай мовай, вучыць іншых паважаць сваё беларускае слова. Трэба збіраць вакол сябе аднадумцаў, каб змагацца за адкрыццё беларускамоўных класаў, Беларускага нацыянальнага ўніверсітэта. У час пасяджэння на бачным месцы красаваўся плакат "Жыве беларуская мова!". І яна будзе жыць, бо моладзь выказвае запатрабаванне карыстацца ёю ў паўсядзённым жыцці. А для гэтага мова наша такая ж прыдатная, як нямецкая ці французская.

Таццяна ТРАФІМЧЫК,
старшыня Слонімскай
суполкі ТБМ

СИНИЦЫН ГОТОВИТСЯ СТАТЬ ПРЕЗИДЕНТОМ



Неожиданное возвращение в белорусскую политику бывшего вице-премьера Леонида Синицына оказалось бурным и стремительным. Два послания, направленные Синицыным депутатам белорусского парламента, привлекли внимание СМИ. В первом Синицын предостерег от распродажи госимущества перед президентскими выборами. Второе письмо касалось организации этих самых выборов.

Синицын предложил парламентариям проявить большую активность в регулировании будущего избирательного процесса. И проект постановления, предложенный им, предусматривает фактически отстранение Александра Лукашенко от возможности административного влияния на ход выборов.

Что движет Синицыным, журналист попытался это выяснить в ходе интервью.

– Вы фактически предлагаете провести досрочные выборы. Почему? Ведь объективно это выгодно скорее действующему президенту, поскольку его противники подготовиться к выборам не успели и до 15 июля вряд ли успеют.

– Я говорю не о досрочных выборах, а о необходимости скорейшего осознания парламентом своей роли в предвыборный год. Парламент должен назначить выборы, не только дату, а выборы как таковые. То есть он должен определить срок и регламентировать предвыборный период. И это принципиально изменит ситуацию. Тем более, что если в соответствии с Конституцией 1994 года президент был не вправе передавать свои полномочия главы государства комулибо, то после референдума Главный закон страны и Избирательный кодекс, напротив, требуют пресечения любых возможностей использования служебного положения, в том числе и президентом. Практика применения президентом этих норм Конституции и законов уже достаточно апробирована. Вспомните, он сам говорил кандидатам в депутаты, занимающим государственные посты: освободите свое место на время выборов и занимайтесь выборами. Такой же подход должен быть и в отношении его самого, если власть последовательна.

Что же касается готовности, то к выборам должны быть готовы все и всегда. Если наша любимая оппозиция семь лет после избрания Лукашенко не готовилась к выборам, то чем она вообще занималась? Ездила в гости к международным организациям? Тогда зачем эти люди шли в политику? Шли бы работать в МИД. Политики к выборам должны быть готовы всегда. Тем более, что, по-моему, одни выборы в 1999 году они уже успели провести и даже чуть ли не выбрали президента. Или это была не подготовка?

— Почему вы предлагаете провести выборы летом, ведь отпускной сезон, в принципе, не очень благоприятное время для выборов?

– Президентские выборы 1994 года проходили в июне-июле, и лето никому не помешало. И явка была рекордной. Вы хотите сказать, что за семь лет народ изменился настолько, что просто не понимает, когда решается его судьба? Кроме того, я фаталист – мы и в прошлый раз выиграли летом.

— "Мы" — это Лукашенко?

– "Мы" – это те, кто был против действующей власти.

— Чем будет заниматься группа по координации деятельности государственных органов, которую вы предлагаете создать, и для чего она нужна?

– Как только Александр Лукашенко заявил, что будет участвовать в выборах, он перестал быть гарантом объективности этого процесса. И сегодня очевидно, что заинтересованное лицо не может определять правила игры. С другой стороны, в стране есть два института, избранные народом, – президент и парламент. И один из этих политических субъектов – президент – должен сойти со сцены на период выборов. Соответственно, второй должен взять на себя функции гаранта. Для осуществления оперативного контроля за ходом выборов парламент и должен создать этот орган (не президентской же администрации это поручать). Эта группа не будет подменять избирательные комиссии – ее задача координировать деятельность всех ветвей власти по обеспечению выборов и одновременно обеспечивать контроль гражданского общества за деятельностью власти.

— И все же, некоторые ваши предложения выглядят явно нереальными. Речь даже не о том, что президент не захочет их выполнить. Дело в технической невыполнимости этих требований. Ну, невозможно в недельный срок подготовить отчет о семилетней деятельности Лукашенко на посту главы государства... И избирательное законодательство так быстро поменять вряд ли возможно.

– И все же я настаиваю, что все требования, которые я сформулировал, абсолютно реальны. Самая "долгоиграющая процедура" – это законодательство.

Тут только один выход: президент подписывает временный декрет, который удовлетворяет всем требованиям, которые сформулировала ОБСЕ, а парламент должен дать президенту право принять такой декрет. Что же касается отчета о семилетней деятельности на посту главы государства, то вы плохо думаете об Александре Григорьевиче, если считаете, что этот отчет еще не готов.

— В одном из интервью вы сказали, что возвращаетесь в политику как гражданин. Однако, действия, которые вы предпринимаете, более характерны все-таки для политика. Леонид Синицын намерен баллотироваться в президенты, или он помогает кому-то другому?

– Я пытаюсь помочь стране. Странные вы люди – журналисты: я им – о супе, а они – о мухах. О стране нужно думать. О ее перспективах. Об экономике, о системе государственного устройства, о людях, которых нужно кормить и обеспечивать работой... Это позиция гражданина или политика?

По-моему, гражданина, причем всякого нормального гражданина. Речь должна идти о курсе, а не персоналиях. Важно правильно понимать, что должно быть в финале, и как добиться наиболее благоприятного для страны развития событий. Я противник ленинского подхода: давайте ввяжемся в драку, а потом посмотрим...

— Но в драку-то вы уже ввязались...

– Это не я ввязался, это страну затянули в гордиев узел. А я уже – вместе со всеми, как человек, живущий в этой стране и никуда съезжать не желающий.

Алексей ПАВЛОВИЧ

"СВАБОДНЫ ПРАФСАЮЗ" У МАСТАХ ПАЧНУЦЬ АДСТРЭЛЬВАЦЬ

Стварэнне "Свабоднага прафсаюза" на сумесным беларуска-германскім прадпрыемстве "Самана плюс", што ў Мастах, выклікала абурэнне ў яго кіраўнікоў і мясцовай "вертыкалі".

Генеральны дырэктар "Самана плюс" Аляксандр Шумік і яго намеснік робяць выгляд, што ў іх не існуе такой арганізацыі, якая зарэгістравана ў Мінюсце, і праект калектыўнай дамовы яны не хочуць разглядаць. Мастоўскі райвыканкам не ставіць прафсаюз на ўлік, нягледзячы на тое, што ўсе дакументы аформлены юрыдычна правільна. Паколькі прафсаюз працягвае сваю дзейнасць, адміністрацыя прадпрыемства пачынае пагражаць яго сябрам фізічнай расправай. Напрыклад, дырэктар вытворчасці Генадзь Седач, спадзеючыся, што ён размаўляе адзін на адзін са слесарам Сяргеем Нарынкевічам, сказаў наступнае: "Хутка мы вас будзем па аднаму адстрэльваць". Паколькі тое чулі іншыя людзі, быў складзены адпаведны дакумент, які адрасаваны кіруючым органам "Свабоднага прафсаюза". Зараз разглядаецца пытанне падачы скаргі ў пракуратуру.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ПРЕДПРИНИМАТЕЛЯМ – НАДЕЖНУЮ ЗАЩИТУ

Решение о создании информационного центра и корреспондентских пунктов Палаты индивидуальных предпринимателей при Минском столичном союзе предпринимателей и работодателей (МССПиР) принято на заседании координационного совета этой организации.

Как сообщил БелаПАН исполнительный директор Палаты Владимир Фролов, центр будет оказывать членам организации информационную поддержку, а также заниматься сбором и обобщением информации с мест о проблемах, возникающих в работе индивидуальных предпринимателей, для последующего оказания им необходимой правовой защиты. Контакты будут осуществляться по телефону "горячей линии" в Минске (230-34-02), а также по факсу (230-86-42), который будет работать круглосуточно.

Ирина САЗАНОВИЧ

"САЛІДАРНАСЦЬ" У МАСТАХ

Па запрашэнню альянсу "Дэмакратычнае Панямонне" Масты наведалі прадстаўнікі польскага прафсаюза "Салідарнасць" з Гданьска Міраслаў Сербановіч, Януш Забега, Ян Плата-Пшахлеўскі.

На працягу двух дзён госці пазнаёміліся з горадам і раёнам, наведалі музей "Лес і чалавек" і Гудзевіцкі літаратурна-краязнаўчы музей, мелі шэраг гутарак з прадстаўнікамі грамадскасці. Напрыканцы візіту госці сустрэліся з актывістамі "Свабоднага прафсаюза" сумеснага беларуска-германскага прадпрыемства "Самана плюс", дзе абмеркавалі праблемы рабочага руху. На думку Януша Забегі, палепшыць сваё становішча рабочыя могуць толькі актыўнымі дзеяннямі, скіраванымі на абарону сваіх інтарэсаў.

Склаліся ўсе перадумовы для будучага супрацоўніцтва між рэгіёнамі.

Язэп ПАЛУБЯТКА

В БЕЛАРУСИ 2,5 миллиона пенсионеров



Фота Віталя Гіля

200 тысяч белорусских граждан получают пенсии ниже бюджета прожиточного минимума. Такие данные журналистам привела министр социальной защиты страны Ольга Даргель на пресс-конференции в Минске.

В первом квартале нынешнего года минимальная пенсия по возрасту составила 22.474 рубля, средняя – 41.762, максимальная (для неработающих пенсионеров) – 64.938, бюджет прожиточного минимума – 37.996 рублей. По отношению к средней зарплате, средняя пенсия по возрасту составила 45,9 процента, все виды пенсий – 43,8 процента. Это, по словам Даргель, лучше, чем в первом квартале прошлого года (соответственно 39,4 и 37,8 процента). В январе 2001 года был изменен механизм исчисления размера минимальной пенсии по возрасту, что позволило повысить пенсии лицам, имевшим небольшой заработок (в качестве примера министр привела работников сельского хозяйства). В феврале были повышены пенсии в связи с ростом средней зарплаты и размера бюджета прожиточного минимума, в марте – пенсии за выслугу лет государственным служащим. В настоящее время в стране насчитывается 2 миллиона 560 тысяч пенсионеров.

По информации Даргель, к концу года будет разработан законопроект "О государственном пенсионном страховании и страховых пенсиях", который заменит ныне действующий закон "О пенсионном обеспечении". Министр заявила о необходимости большей дифференциации пенсий в зависимости от заработка и дифференцировании размера бюджета прожиточного минимума (БПМ): "В Минске должен быть один БПМ, побольше, в каком-нибудь городском поселке, в сельской местности – другой, поменьше".

Дмитрий ВЛАСОВ

Газета Слонімская
24 — 30 траўня 2001 г., № 21 (207)

НАВІНЫ

ПРЭМ'ЕРА
Ў ШКОЛЬНЫМ ТЭАТРЫ

Каля шасці гадоў існуе тэатр у слонімскай сярэдняй школе №8. Кіруе ім былая артыстка Слонімскага беларускага драмтэатра Таццяна Натарава.

Вучні-артысты паставілі ўжо чатыры спектаклі. А ў мінулую пятніцу на школьнай сцэне адбылася прэм'ера новай казкі "Сястра мая - русалачка" па п'есе Людмілы Разумоўскай. У спектаклі занятыя не толькі вучні, але і настаўнікі. Усё ж гледачам найбольш спадабаліся русалачка і прынц, ролі якіх выканалі юныя артысты гэтай школы Юлія Лазоўская і Аляксандр Ганчарук.

Пастаноўку спектакля ажыццявіла студэнтка-практыкантка Мінскага інстытута культуры Анжэліка Прэдка, а ёй дапамагла Таццяна Натарава. Музыку напісаў Алег Грасевіч.

Сяргей ЧЫГРЫН,
Віталь ГІЛЬ (фота)

ФОРТЕПИАННЫЙ КОНЦЕРТ ДЛЯ РОДИТЕЛЕЙ

Фота Віталя Гіля

На прошлой неделе в музыкальной школе Слонима состоялся фортепианный концерт для родителей.

Ребята, с которыми занимается Елена Расточилова, исполняли произведения как известных классиков, так и современных.

Юные пианисты Анюта Власова, Елена Шундрик, Татьяна Саванчук, Александра Козловская, Мария Кринчик, Алексей Лебедев, Татьяна Городко, Наталья Кононович, Павел Филитович устроили присутствующим настоящий праздник.

Ольга ШИНКЕВИЧ

НАВІНЫ

Тля з'ела дуб

Усё лісце дрэў, а гэта ў асноўным дубы, на левабярэжжы Нёмана з'ела тля.

Гэтыя веліканы, у асноўным, узвышаюцца ў зоне адпачынку мастаўчан. А паколькі дрэвы растуць на беразе ракі і лесапаласа цягнецца на некалькі кіламетраў, то, па меркаванню спецыялістаў, прымяненне ядахімікатаў у барацьбе са шкоднікамі немагчымае.

Антон МАКЕЙ

Пярнаты госць

Гэты малады пярнаты філін нядаўна завітаў "у госці" да вучняў Сялявіцкай сярэдняй школы ў час, калі яны працавалі на прышкольным участку.

Некалькі гадзін запар ён нерухома сядзеў на плоце і аглядаў сваімі жоўтымі вачыма наваколле. Здавалася, што ён спіць, але, калі я падышоў з фотаапаратам бліжэй, малады філін хутка выказаў свой агрэсіўны намер - зашыпеў, падняў крылы. Прыйшлося прыкручваць на мой старэнькі "Зеніт" доўгафокусны аб'ектыў.

Узнікае пытанне: чаму лясная птушка, якая палюе ноччу, прыляцела днём у населены пункт? Можа, не хапае ежы? А можа вельмі захацелася паглядзець, як жывуць і што робяць дзеці нашай школы?

Сяргей КЛЁСАЎ,
настаўнік Сялявіцкай сярэдняй школы

КРИМИНАЛ

Белорусского студента в США осудили на 15 лет

24-летний студент из Беларуси осужден в США на 15 лет тюрьмы за управление автомобилем в нетрезвом виде, что привело к аварии, в которой погиб человек, сообщает американское агентство новостей Associated Press.

Алексей Шахиров, который учился в университете Клемсона (штат Южная Каролина), сел 14 января пьяным за руль автомобиля Volvo после того, как поругался со своей подружкой, пишет агентство. Уровень алкоголя в его крови составлял 0,252%, что соответствует 10 поллитровым бутылкам пива, выпитым за час. Выехав на встречную полосу, Volvo столкнулась с пикапом, на котором двое местных жителей ехали охотиться на диких кроликов. В результате 58-летний Дойл Кроуфорд погиб, а его 37-летний сын получил тяжелые повреждения.

Г-н Шахиров признал себя виновным. Адвокаты говорят, что после тюремного заключения его ожидает депортация, пишет Associated Press.

БелаПАН

віншаванні

Дорогой и любимый сыночек и брат
Александр Николаевич ЗАЛЕТАЕВ!
Поздравляем тебя с днём рождения!

Пусть жизнь твоя полнее станет,
И с каждым днём ты будь мудрей,
Пусть долго молодость не вянет,
И жизнь проходит веселей,
Пусть будут радость и веселье,
Ведь только этим мы живём,
И говорим мы: "С днём рожденья!
Со светлым и счастливым днём!"

Любящие тебя мама, папа и брат Серёжа

Дорогая наша и любимая доченька
Наталья ПРОКОПОВИЧ!
От всей души поздравляем тебя с днём рождения!

Пусть этот день, который ты встречаешь,
Счастливой датой в жизнь твою войдёт,
И всё хорошее, о чём мечтаешь,
Пусть сбудется и пусть придёт.
Пусть в счастье распахнуться двери,
И всё, что будет, прожито не зря.
Ты знай: в тебя мы очень верим
И очень любим мы тебя.

Здоровья, верных друзей и удачи в жизни.

Любящие тебя родители

Дорогая и любимая
Танечка ФЕДОРОВИЧ
поздравляю с днём рождения!

Пусть этот день, который ты встречаешь,
Счастливой датой в жизнь твою войдёт,
И всё хорошее, о чём мечтаешь,
Пусть сбудется и пусть придёт.
Пусть в счастье распахнутся двери,
И всё, что было, прожито не зря.
Ты знай: в тебя я очень верю,
И помни: я люблю тебя!

Твой Рома

Светлану Ивановну КОСТЮШКО
поздравляем с днём рождения!

С днём рожденья поздравляем!
Счастья в жизни Вам желаем.
Чтоб прожить весь этот год
Без тревог и без хлопот,
Чтобы чаще улыбались,
Чтобы все мечты сбывались,
И в году чтоб в этом новом
Непременно быть здоровой.

Семья Гвай

Дорогая доченька
Юлечка РОГОЗИК!
Поздравляем тебя с 18-летием со дня рождения!

Желаем всего прекрасного в этом мире и на этой земле.

Пусть радостью глаза твои искрятся,
Улыбка никогда не сходит с губ.
Умей, когда и трудно, рассмеяться,
Улыбкой погасить любой недуг,
Умей любить и ждать, и верить людям,
Ни злости, ни корысти не тая.
Будь загадочной и желанной,
Самой нежной и долгожданной,
Самой любимой и самой красивой,
Самой-самой на свете счастливой!

С любовью мама, папа

Дорогой, милый и родной
Николай КОЛОС!
От всего сердца, с огромной любовью и теплотой поздравляем тебя с 18-летием!

Желаем быть всегда красивым,
Всегда любимым, молодым,
В кругу семьи — всегда счастливым,
В кругу друзей — всегда простым.
Живи, родной наш, долго-долго
И не считай свои года.
Пусть радость, счастье и здоровье
Тебе сопутствуют всегда.

Любящие тебя папа, мама, братья Александр и Андрей

Дорогая
Светлана Ивановна КОСТЮШКО!
Поздравляю тебя от всей души с днём рождения!

Храни тебя на свете Бог,
Живи подольше.
Прости, родная, что не смог
Сказать побольше.
Живи для счастья, для души,
Нельзя иначе.
— Мы павінны рэчы ў людзей купляць. Тым больш цяпер, калі ў іх няма грошай і нехта хоча сёетое прадаць, каб атрымаць за гэта нейкую капейку. Раней нам у асноўным дарылі, а цяпер — не. Таму музей купляе вартае ўвагі. Але і нам на гэта выдаюць зусім мала грошай, стараемся неяк дамовіцца...

— Многія ўнікальныя экспанаты зніклі ў вайну і ў першыя пасляваенныя гады з нашага музея. Дзе яны і ў каго знаходзяцца? Ці ставілася пытанне аб іх пошуках і вяртанні ў Слонім?

— Мы ведаем, напрыклад, што карціна Верашчагіна "Абаронцы Святой Троіца-Сергіевай Лаўры" знаходзіцца ў Гродзенскім абласным музеі. Але дакументаў, што карціна наша, у нас ніякіх няма. Адно вядома, што са Слоніма карціну ўзялі нібыта на рэстаўрацыю. Так яна трапіла ў Гродна.

У музеі захоўваецца цэлы спіс прапаўшых у вайну экспанатаў. Яго склалі Іосіф Стаброўскі, Сяргей Новік-Пяюн і іншыя былыя супрацоўнікі музея. За маю бытнасць ніхто і ніколі не ўздымаў пытанне аб зніклых экспанатах са Слонімскага музея і вяртанні іх нам. Відаць, пара гэта зрабіць не толькі на ўзроўні горада, вобласці, але і ўсёй рэспублікі. Бо толькі з нашага музея зніклі дзесяткі розных каштоўных і дарагіх экспанатаў.

— Ці падтрымлівае музей сувязі з іншымі музеямі Беларусі і свету? З кім вы перапісваецеся, сябруеце?

— Мы сябруем з супрацоўнікамі музея Войска Польскага, што ў Варшаве. У іх захоўваецца сцяг Слонімскага павета XVII стагоддзя. Мы хочам набыць сабе гэты сцяг, ці хаця б зрабіць добрую копію.

— Ірына Рыгораўна, Вы, як дырэктар Слонімскага музея, аб чым сёння марыце? Што Вам асабіста хацелася б зрабіць у нашым старажытным горадзе, змяніць, пабудаваць, набыць і г.д.?

— Хочацца правесці на старым слонімскім замчышчы раскопкі, паказаць там старажытны Слонім з усёй яго археалогіяй, як зроблена, напрыклад, старажытнае Бярэсце. Музей СШ №4 г. Слоніма "перарос" школьны музей, і яго неабходна зрабіць нашым філіялам, і ўсе экспанаты, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной, перанесці туды. А ў нашым музеі шырэй паказаць сярэднявечча, жыццё і дзейнасць Сапегаў і Агінскіх. Наогул, Слонім наш пара рабіць горадам-музеем, горадам-лялькай для яго жыхароў і турыстаў. Тым больш, што побач са Слонімам знаходзяцца Сынковіцкая царква XV стагоддзя, Жыровічы, Альбярцін з маёнткам Пуслоўскіх. Вось пра гэта сёння думаецца мне і марыцца.

— Заснавальнікам музея і яго дырэктарам шмат гадоў быў вядомы краязнавец, гісторык і археолаг Іосіф Стаброўскі. Ці не пара ўжо ў Слоніме ўвекавечыць яго імя?

— Пытанне наконт перайменавання Камсамольскай вуліцы ў вуліцу Іосіфа Стаброўскага застаецца нявырашальным, бо, кажуць, няма грошай. Там жыў Стаброўскі, там стаіць яго хата, і гэта вуліца павінна насіць яго імя.

Што датычыць мемарыяльнай шыльды Стаброўскаму, дык яна ўжо зроблена слонімскім скульптарам Леанідам Богданам і бясплатна перададзена музею. Дакументы на ўстаноўку гэтай шыльды ўжо знаходзяцца ў Міністэрстве культуры. А ў Слонімскім гарвыканкаме хутка будзе разглядацца пытанне аб наданні музею імя Стаброўскага.

— У якіх адносінах Вашы супрацоўнікі з кіраўнікамі школьных музеяў горада Слоніма?

— У самых добрых. Мы ім дапамагаем, сябруем з музеямі СШ №4, 2, 10, 5, 1 г. Слоніма і з музеем Дзераўноўскай сярэдняй школы Слонімскага раёна. Мы прагледзелі іх фонды, склалі ахоўныя абавязкі, узялі на дзяржаўны ўлік самыя каштоўныя экспанаты музеяў гэтых школ. Тэрмінова трэба аднаўляць музей Валянціна Таўлая ў першай школе, а музею Дзераўноўскай школы неабходна надаць званне народнага. Дапамагаем мы і школьным музейным куткам, найперш літаратурай, ксеракопіямі дакументаў і фотаздымкаў.

— У наступным 2002 годзе слонімцы будуць адзначаць 750-годдзе роднага горада. Хацелася б ад Вас, Ірына Рыгораўна, пачуць каментарый па гэтай даце. Справа ў тым, што першыя ўпамінанні аб ім у хроніках датуюцца 1040 годам. Згадваецца ён пад гэтай датай і ў летапісе "Аповесць мінулых гадоў".

— Упершыню Слонім упамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1252 годам як Услонім, Васлонім: "Данил же и Василько, брат его, разгадав со сыном, брата си посла на Волковыеск, а сына на Услоним, а сам иде ко Здитову: и поимаша грады многы, и взвратишася в домы". Менавіта вось гэта дата — 1252 — і лічыцца датай заснавання Слоніма. Так што ў наступным годзе мы адзначым яго 750-годдзе. Хаця Слонім, вы мяркуе рацыю, існаваў значна раней, і яму ўжо тысячу, а то і больш гадоў.

— Ірына Рыгораўна, Вы больш сочыце за навуковымі і гістарычнымі выданнямі. Ці шмат напісана і пішацца пра наш Слонім?

— У 1999 годзе Слонімскаму краязнаўчаму музею споўнілася 70 гадоў. Музей заслугоўвае вялікага будынка, каб шырока і грунтоўна паказаць гісторыю зямлі Слонімскай. На вялікі жаль, навукоўцы і гісторыкі неяк абыходзяць Слонім, нібыта ён не мае сваёй гісторыі. Больш пішуць пра Полацк, Навагрудак, Мсціслаўль, Нясвіж, Вільню, а Слонім неяк застаецца ўбаку. Наш горад меў і мае найвялікшую і багатую гісторыю. Адсюль родам знакамітыя музыкі, мастакі, пісьменнікі, палітыкі, вучоныя. На працягу 88 гадоў у Слоніме праходзілі сеймікі Вялікага княства Літоўскага. Гэта значыць, што наш горад быў маленькай палітычнай сталіцай. А пры Агінскім Слонім стаў "паўночнымі Афінамі". Ён заслугоўвае большай увагі, як з боку палітыкаў і вучоных, так і з боку гісторыкаў.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЭТИ СТРАННЫЕ, странные немцы
или записки гастарбайтера

(Продолжение. Начало в №№ 17,18,19,20)

По немецкому TV идут антифашистские сериалы (например, "Семья Клемпер"). Огромный положительный резонанс в прессе вызвал наш фильм "Иди и смотри".

Немецкое правительство подаёт пример во время проведения различных мероприятий, связанных с памятью жертв Холокоста. Немецких школьников и студентов можно постоянно встретить в бывших концентрационных лагерях. Однажды в Освенциме (Аушвиц) я разговорился с группой таких экскурсантов. В беседе я узнал, что они не только ухаживают за могилами советских солдат, пленных, за еврейскими кладбищами, но и ездят во время каникул за свой счёт бесплатно работать в Израиль.

Был случай, когда кто-то в одном немецком городе бросил в закрытые двери синагоги "коктейль Молотова" (бутылки с зажигательной смесью). Во всех газетах и по TV прошла волна протеста. Журналисты поспешили обвинить в этом правых радикалов. Но полиция сработала оперативно и быстро арестовала двух палестинцев, организаторов поджога двери.

По всей стране прошли массовые демонстрации протеста после взрыва гранаты в Дюссельдорфе около группы евреев- эмигрантов из бывшего Советского Союза. Тогда несколько человек получили ранения. На другой день на улицы Дюссельдорфа вышло 40 тысяч человек, протестующих против проявлений неонацизма. Опять пресса поспешила обвинить во всём ультраправых, хотя у следствия была серьёзная версия, что это результат каких-то уголовных разборок в среде эмигрантов, а не неонацистский терракт. Немецкая Конституция не даёт возможности возродиться фашизму. Государство жестоко преследует деятельность как ультраправых, так и ультралевых группировок.

Наша молодёжь, их молодёжь...

Однажды в поезде я познакомился с двумя студентами из Винницы. Они учились в каком-то экономическом вузе под Берлином и получали стипендию 450 марок ежемесячно. Половину денег мои новые знакомые отправляли домой своим близким. В этом же вузе занимаются ещё 40 человек их земляков из Украины. На вопрос: "Есть ли у них студенты из Беларуси?" последовал ответ: "Да, есть одна девочка из Минска. Не хотелось бы из одного факта делать какие-то обобщения, но всё равно, как-то непонятно — сорок и одна? Неужели Беларусь в сорок раз меньше Украины? Или это следствие всё той же политики, когда руководитель государства "не собирается вести свою страну за цивилизованным Западом." Кстати, если наш президент всё - таки станет "выездным" и посетит Германию, то пусть он не пугается обилию оппозиционных (бело-красно-белых) флагов на городских дорогах. Здесь нет никакой "политики": уже давно такая расцветка флага употребляется в Германии в местах дорожно-строительных работ и обозначает такой флаг: "Стоп! Объезд.", "Стоп! Дороги нет!" и т. п.

Среди немецкой молодёжи распространён культ техники: ребята-старшеклассники почти все имеют мотоциклы, а девушки — элегантные мотороллеры. Две машины в немецкой семье — явление обычное. Так что, с 18 лет молодёжь пересаживается с двухколёсного транспорта на четырёхколёсный. Ездят они побыстрее, чем у нас, хотя управлять автомобилем там сложнее, чем в Беларуси: ведь большая часть Германии — это горы и предгорье. Ещё одно маленькое уточнение: в немецких городах допустимая скорость не 60 км/час, как у нас, а 50.

Ещё в прошлом году и дети, и взрослые любили в выходные дни выехать всей семьёй покататься на роликах. Сейчас — новая мода: скутер или роллер, а проще говоря — наш родной самокат, только модернизированный. Любят немцы и верховую езду. В деревне, где мне пришлось жить, есть конно-спортивная секция. Некоторые жители держат для души 1 - 2 верховые лошадки, а для детей — пони.


Государство активно поощряет увлечение молодёжи спортом. Многое в этом плане делают органы власти. Там нет начальных школ без бассейнов. Даже в деревнях есть большой выбор спортивных секций: большой теннис, лыжный слалом (тренируются и летом), гольф, восточные единоборства, велоспорт, стрельба,футбол, баскетбол. Есть в этой сфере и один парадокс: несмотря на почти поголовное увлечение спортом, можно заметить, что почти вся молодёжь в Германии курит. Чем это объяснить — трудно сказать. Конечно, не последнюю роль в этом коварном деле играют табачные фирмы, организовавшие через СМИ мощный поток рекламы своей продукции.

Излюбленным немцам семейным видом спорта у немцев является всё же велосипедный. Интересно наблюдать, как семьи, вместе с детьми (самые маленькие в специальных сиденьях) совершают субботне-воскресные прогулки по заасфальтированным лесным дорожкам.

Достать в Германии подержанный, но в хорошем состоянии велосипед — не проблема. Он вам очень облегчит жизнь для поездок в поисках работы, по магазинам, на прогулки, пока вы не приобретете автомобиль. Итак, два раза в месяц немцы выставляют на тротуарах около домов ненужные бытовые вещи, так называемый "шпермюль". Образуются целые кучи из холодильников, телевизоров, стиральных машин, газовых и электроплит, микроволновок, мебели, ковров, велосипедов... Большинство этих вещей в хорошем рабочем состоянии. Вот из этих куч можно свободно и смело брать приглянувшуюся вам вещь. Если же вы увидите около почты, магазина или какой-нибудь конторы оставленный непристегнутый велосипед, то лучше его не трогать и обойти стороной: вдруг через минуту появится хозяин.

Иван ХОХОЛ

(Продолжение следует)



Цімур КУЦ

Свой першы верш "Приход весны" я напісаў у дванаццаць год, але сустрэўся з адмоўнай крытыкай і паўтары гады не садзіўся за стол з мэтай нешта стварыць. Зноў падштурхнула да напісання вершаў першае каханне. Цяпер каханне — не галоўная тэма маіх твораў. І большасць з іх зараз — проза на беларускай мове.

ЖЫЦЦЁ ПАСЛЯ ЖЫЦЦЯ

Бесклапотнае дзяцінства. Марожанае-пірожнае, усеагульная любоў і пяшчота. Першы паход у школу, жыццё ў грамадстве.

Пераходны ўзрост. Піва, цыгарэты, нянавісць да навакольнага свету. Першае каханне. Потым – нянавісць да яе. Прага свабоды.

Праходзіць некалькі гадоў. Цалкам засяродзіўся на сабе. Пляваць на ўсё.

Выкурыў два пачкі, адзін за адным. Таксама пляваць. Дождж за акном.

Люблю дождж. У хаце цёмна. Люблю цемру. Чаго баяцца, чаму радавацца, як жыць – не ведаю.

Стаю на карнізе. Даволі высока, але не вышэй, чым звычайна. Лячу.

Раніца. На зямлі ляжыць цела. Зямля марудна астывае, і разам з ёй – цела. Душа ўзлятае да Сонца і пяе. Але натыкаецца на сцяну. Ха! А хто абяцаў свабоду? Падманулі. Зноў падманулі. А цела ўжо зусім астыла.

І што змянілася? На Зямлі не стала ні лепш, ні горш ад таго, што ўжо няма аднаго-адзінага чалавека. Вельмі хутка ўсе забудуцца пра яго. А душа заўсёды будзе памятаць пра тых, з кім ішла па мінуламу жыццю.

Усё аднолькава – што там, што тут. Складана толькі ДЗЕ гэта ТАМ і ЯК гэта ТУТ.

САПРАЎДНАЕ ШЧАСЦЕ

Паглядзіце на бязвоблачнае неба ноччу. Ззяюць зоркі, аб'яднаныя ў сузор'і. Для чаго? Для таго, каб не губляцца ў бясконцай цемры сусвету, каб бачыць адна адну. Яны ззяюць і маўчаць. Не трэба слоў. Зоркі ўсё разумеюць. Што яны – адна сям'я, што неабходна дапамагаць, няхай і ззяннем, каб не загінуць у адзіноце і ў той жа час застацца вольнымі. Яны сябруюць, каб быць разам.

Параўнайце дзень і ноч. Дзённае свяціла Сонца і начное – Месяц. Некалі вельмі даўно яны пасварыліся і не асвятляюць ужо разам Зямлю. Пасварыліся незваротна. Мы ўсе добра ведаем, што Месяц, на самай справе, не сам свеціць, а адлюстроўвае святло Сонца. Значыць, Сонца жадае памірыцца з былым сябрам, пасылаючы частку сябе. А горды халодны Месяц маўчыць, хаваецца за Зямлю, лічыць, што ён і адзін будзе добра жыць. Дурны...

Так і мы, людзі. Не імкнемся да таго, каб быць разам. Для нас даражэй колькасць грошай у кішэні, чым верны сябар. Лепш не бачыць далей свайго носа, чым нешта зрабіць для іншых. Так і жывём, перацягваем кафтан кожны ў свой бок. А не парвецца? Калі сёння свет падзяляецца на бедных і багатых, заўтра ён можа раскалоцца напалам. Дурныя...

Чаму, ну чаму мы не разумеем, што жывём у адной вялікай дзяржаве з назвай Зямля і з'яўляемся грамадзянамі гэтай дзяржавы? Таму, што жадаем улады, маёмасці і не прыкмячаем галоўнага – таго, што не купіш за грошы.

Такое жыццё мы называем шчасцем. Але дзе яно?

Наталья ЧАЛОВА,

13 лет, ученица 7 "Д" класса СШ №2 г.Слонима



Детство

Детство милое!
Не улетай, не надо!
Я прошу: не нужно убегать.
Я взрослеть
ни капельки не рада —
Это сердцем
можно лишь понять.
В детстве я стихи читала, пела
И летала где-то в облаках.
Я, конечно, многого хотела,
Что увидеть можно
только в снах.
Все игрушки были, как живые,
Я играла с ними, как во сне.
Те мгновенья детства золотые
Возвратить бы
на минутку мне.


Учителю

В день осенний, когда у порога
Задышали уже холода,
Школа празднует
День педагога —
Праздник мудрости,
знаний, труда.
День учителя!
Вслушайтесь сердцем
В эти звуки, что дороги нам.
Всем, что связано
с юностью, с детством,
Мы обязаны учителям.
Сил вы нам отдаёте немало
И любви, не смотря ни на что.
Как вы верите в нас,
что, пожалуй,
Верить так не умеет никто.

Не забудь


Ранним утром, чуть проснувшись
И остатки сна храня,
Полусонно улыбнувшись, —
Вспоминай меня.
Жарким днём, в тени берёзы
Родничок бежит, звеня,
Рядом ты, мечты и грёзы...
Вспоминай меня.
Поздним вечером спокойным,
На исходе дня,
С трепетом в груди невольным
Вспоминай меня.
Ранним утром, днём и ночью,
Сердцем всем любя,
Обо всём забудь на свете,
Только — не меня.

Малюе Сяргей Алізарчык






Сяргей Алізарчык нарадзіўся 9 траўня 1980 года ў Слоніме ў сям'і вайскоўца. З дзяцінства давялося паездзіць па розных месцах службы бацькі. Пяць год сям'я жыла ў Чэхаславакіі, потым — у Слуцку. А ў 1992 годзе зноў пераехала ў Слонім. Тут Сяргей скончыў сярэднюю школу і ПТВ-129 па спецыяльнасці кухара, адслужыў тэрміновую вайсковую службу. Але з войскам не развітаўся — застаўся служыць кантрактнікам. Сяргей любіць чытаць, займаецца спортам, захапляецца музыкай. Але перадусім ён мастак, і як сам прызнаецца, карыкатуры — яго хоббі.



ПРЭМ'ЕРА ПЕСНІ

АХ, ТЫ ЛЕЦЕЙКА-ЛЕТА...

Словы Івана **Цімафейчыка**, музыка Уладзіміра **Сарокіна**



Па вясне прыйдзе лета...
І на золачку светлым
Вецер ласкавы, ветлы,
Скажы ўсё, што не ўспеў!
Лету, звонкаму лету,
Падару я куплеты —
Хай гуляюць санеты,
Поўняць сэрца напеў.

Прыпеў:

Хай пяе салавей
Пераліўнаю змейкай,
Успамінам сагрэй,
Мая радасць-жалейка.
Закахаю ў гаі,
Я цябе закахаю:
Асалодай дваіх
І напоямі гаю.
П'яным водарам гаю...

Дожджык-дождж, сыпані
На гаючыя зёлкі,
Стому з нас прагані,
Радуй вока вясёлкай.
Між лугоў, між палёў,
Дзе пяюць перапёлкі,
Мы прысядзем, спяём
І паладзім на золку,
На світаначку-золку...

Ах, ты лецейка-лета...
Наваколле сагрэта,
І ўзнікаюць сюжэты,
Бы з-пад плуга ралля.

Маё шчырае лета...
Дзе ты, шчасцейка, дзе ты?
І не знікнуць памфлеты,
Калі ў стоме зямля.

Прыпеў.

Маё слаўнае лета
Хай гучыць ў аперэтах,
Смутак згоніць са свету
Дзіўны маг-дабрадзей,
І імчыць ў маё лета
Скакунамі-каметай
У цудадзейнай карэце
Дух узнёслых надзей.

Прыпеў.

Галіна БЯЛЯЎСКАЯ

Мае мары

Лета жабінай песняй
Сум адновіць далёкі,
Верне раптам дзяцінства,
Бусла белага клёкат.
Я па лузе прайдуся,
Пастаю каля броду,
Пагляджу я, як гусі
Менцяць крыламі воду,
Сяду ў травах ля рэчкі,
Кіну вокам на неба:
Там аблокі-авечкі
Паплылі, дзе ім трэба.
Я ўжо плыць разам з імі
Не хачу, як калісьці.
З дрэва мараў юнацкіх
Ціха падае лісце.
Тут, на гэтым вось лузе,
Склалі мары ўжо крылы.
Мне нічога не трэба,
Толькі б сонца свяціла,
Быў бы луг, цвілі б кветкі,
І збіраць іх жаданне
Не згасала каб з часам.
Каб салоўка да рання
Заліваўся ля рэчкі
Закаханым на ўцеху,
Каб дзяўчаты ля клуба
Шчабяталі са смехам,
І каб сын мой з сябрамі
Весяліў тых дзяўчатак,
Каб спакой быў на сэрцы
І у доме дастатак.
Вось і ўсе мае мары,
Вось і ўсе пажаданні.
Добра мне, калі шчодра
Свеціць сонейка з рання.

Сум расстання

З водарам чаромхі,
З песняй салаўінаю
Аж на тыдзень ты мяне
Сумаваць пакінуў.
Мо з табою разам мы
Салаўя б паслухалі,
Закружылі б мары нас,
Можа, з завірухамі.
Стаў бы куст чаромхі
Ад цябе дарункам мне,
Мо б юнацтва ўспомнілі
З тымі пацалункамі?
Быў ты б тут, цяплейшымі
Сталі б дні халодныя.
Можа, вецер сцішыўся б,
І дажджы злагоднелі?..
Не залежаць, ведаю,
Ад цябе абставіны.
Ты прыедзеш. Толькі мне
З сумам цяжка справіцца.

Лілія ШУЛЯК



Маміна хатка

Траўка расце, кветкі цвітуць,
Ветрык лагодна вее,
Сонейка свеціць, хмаркі бягуць,
Ягадка ружавее.

Дзесьці далёка дзяцінства пара
Знікла, бы ў белай завеі,
А ў адчуванні святла і дабра
Сэрца жыве надзеяй.

Колькі ў вёсачцы хатак
пустых
У маркоце стаяць адзінока!
І маміна хатка ўжо сярод іх.
Сум пазірае ў вокны.

Вокны яе мне у душу глядзяць,
Думкі лятуць да аблокаў.
І мроіцца мне,
што матуля ў акне
Мяне выглядае здалёку.

Людміла СІНЯК

Мне б вярнуцца назад

Мне б вярнуцца
назад у дзяцінства,
На палетак, дзе кветкі цвілі,
Басанож пагуляць па гасцінцы
Там, дзе бацька і маці жылі.

Мне б на першае
тое спатканне,
Ў тыя мары і чар забыццё,
Зноў сустрэцца
з вялікім каханнем,
Што прайшло,
як віхор, праз жыццё.

Мне б ізноў усю ноч ля калыскі
Калыханку да рання спяваць...
Як далёка ўсё гэта і блізка,
Ды не вярнуць,
не знайсці, не дагнаць.

АДПАЧЫНАК – НЕ НА КАРЫСЦЬ

Камунальнік — Зорка-ВА-БДУ — 0 : 2

Слонім. 19 траўня. Стадыён "Дынама". 2500 гледачоў.

СУДДЗЯ: Алег Чыкун (Стаўбцы)

КАМУНАЛЬНІК: С.Бекіш, М.Ясінскі (57, А.Мисюк), В.Дзегіль, А.Дзегіль, В.Кірыленка, А.Цішчанка (65, М.Мажэйка), А.Вярбіцкі, Л.Варанцоў, А.Баль, М.Астапчык, Д.Аначэнка.

Галы: 4, Антановіч; 61, Сухавееў.

ПАПЯРЭДЖАННІ: 22, Аначэнка; 28, А.Дзегіль (Камунальнік);

19, Дзерынгоўскі; 42, Марціновіч (Зорка-ВА-БДУ).

Нават непрыемны дробны дождж і халодны вецер не спужалі ў мінулую суботу балельшчыкаў "Камунальніка". Людзі прыйшлі на стадыён, каб сустрэцца з любімай камандай пасля двухтыднёвага перапынку. Нажаль, сустрэча атрымалася малапрыемнай.

Ужо на 4-й хвіліне слонімцы атрымалі зусім недарэчны гол у свае вароты, які, магчыма, і вызначыў увесь далейшы ход гульні. Капітан гасцей Юрый Антановіч нават не прабіваў па варотах "Камунальніка", а рабіў перадачу ў нашу штрафную пляцоўку. Да мяча ніхто з футбалістаў "Зоркі" не паспеў, і Бекішу заставалася завалодаць ім. Але ж, ці то наш варатар памыліўся, ці то мяч нечакана падскочыў на няроўным полі і павольна ўляцеў у сетку, папярэдне крануўшы левую ад Бекіша штангу.

Надалей першая палова матчу прайшла без змен ліку. Мабыць, разы са два галавой прабіў Міраслаў Ясінскі пасля розыгрышу вуглавых падач, ды добра прабіў метраў з дваццаці Аляксей Цішчанка. Але ж мячы міналі вароты. Астатнія намаганні нашых футбалістаў прайсці на добрую галевую пазіцыю разбіваліся аб абарону гасцей.

Другі тайм актыўна пачалі госці. На 49-й хвіліне нападаючы "Зоркі" прабіў з вугла нашай варатарскай пляцоўкі – міма. 59-я хвіліна, прыкладна з адзінаццаці метраў амаль па цэнтры варот б'е восьмы нумар мінчан. Бекіш апынуўся на месцы.

А вось на 61-й хвіліне ён не здолеў выратаваць вароты ад другога гола. Нашыя хлопцы, больш думаючы, як адыграцца, прапусцілі атаку "Зоркі". У выніку адбылася вострая прастрэльная перадача злева ўздоўж варот гаспадароў поля. Нападаючы гасцей Сухавееў удала замкнуў перадачу. 0:2.

Пасля гэтага "Камунальнік" зайграў больш востра. На 65-й хвіліне пасля падачы з вуглавога добра на апярэджанні згуляў галавой Алег Вярбіцкі, варатар мінчан ледзве здолеў перавесці мяч на вуглавы. На 77-й хвіліне здалёк б'е Дзмітрый Аначэнка – мяч пралятае ў метры вышэй перакладзіны. На 79-й хвіліне толькі штанга выратавала "Зорку" ад гола пасля добрага ўдару метраў з 22-23 Мікалая Астапчыка.

За пяць хвілін да фінальнага свістка "Камунальнік" мог яшчэ змяніць лік, калі б мяч пасля нацэленага ўдару Вярбіцкага праляцеў на 10 сантыметраў ніжэй, – з "дзевяткі" яго ўжо ніхто б не выцягнуў.

Крыўднае паражэнне. Але ж наперадзе яшчэ ўвесь сезон. І наступны матч "Камунальнік" праводзіць на выездзе 26 траўня супраць каманды "ЗЛіН" (Гомель).

Валерый КАВАЛЕНКА

ВЫНІКІ астатніх матчаў 5-га тура:

Тарпеда-Кадзіна — Свіслач-Кроўля, 1-2,
Граніт — Хімік, 0-1,
Дарыда — Ліда, 1-0,
Орша — ЗЛіН, 1-1,
Рагачоў-ДЮСШ-1 — Дынама-Юні, 0-0,
Тарпеда — Керамік, 2-1.


Фота Віталя Гіля

ТУРНІРНАЯ ТАБЛІЦА ПАСЛЯ 5-ГА ТУРА

	гульні	В	Н	П	ачкі	мячы
1. Тарпеда	5	4	0	1	12	9-3
2. Хімік	5	4	0	1	12	9-4
3. Дарыда	4	3	1	0	10	5-2
4. Тарпеда-Кадзіна	5	3	0	2	9	6-7
5. Ліда	5	2	1	2	7	6-3
6. Орша	4	2	1	1	7	7-5
7. Зорка-ВА-БДУ	5	2	1	2	7	5-4
8. Камунальнік	4	2	1	1	7	4-3
9. Свіслач-Кроўля	5	2	1	2	7	5-5
10. Керамік	5	2	0	3	6	6-9
11. Дынама-Юні	5	1	2	2	5	7-5
12. Граніт	4	1	1	2	4	4-5
13. ЗЛіН	5	0	2	3	2	3-8
14. Рагачоў-ДЮСШ-1	5	0	2	3	2	3-10
15. Нёман	4	0	1	3	1	4-10

НАВІНЫ

СЛОНІМЦЫ — ВІЦЭ-ЧЭМПІЁНЫ ВОБЛАСЦІ

На першынстве вобласці сярод каманд пазашкольных устаноў, якое традыцыйна адбываецца напрыканцы навучальнага года, паспяхова згулялі шашысты Слоніма.

Нягледзячы на тое, што нашыя шашысты на 2-3 гады маладзейшыя за асноўных сапернікаў, яны вельмі ўпэўнена правялі спаборніцтвы і аказаліся на другім месцы ў турнірнай табліцы.

За каманду гулялі гуртkoўцы цэнтра творчасці дзяцей і юнацтва Юрый Сегень (СШ №8) і вучні СШ №9 Андрэй Мацявін, Віктар Міско, Таццяна Панашчык і Рыта Батура.

Яўген ІВАНОЎ

НЕ САМЫЕ ПОСЛЕДНИЕ В художественной ГИМНАСТИКЕ

В прошлые выходные в Гродно прошло областное первенство по художественной гимнастике. В соревнованиях участвовало 4 команды: две от города Гродно, команда Сморгони и команда Слонима.

Наш город на чемпионате представляли три воспитанницы тренера Елены Макарской: Дарья Старыгина (СШ №5), Марина Дембская (гимназия №1) и Ольга Федорович (СШ №3). И выступили девочки неплохо. Марина Дембская заняла 4-е место, а Ольга Федорович была третьей.

Валерий КОВАЛЕНКО

ДРУГАЯ ПЕРАМОГА "Камунальніка-2"

Чарговы матч першынства Гродзенскай вобласці правеў слонімскі "Камунальнік-2". У нядзелю, 20 траўня, нашыя маладыя футбалісты прымалі на сваім полі каманду Ваўкавыску і перамаглі з лікам 2:1. Галы ў нас забілі Максім Горбач і Аляксандр Боцік.

Хаця на стадыёне "Дынама" ў гэту нядзелю прысутнічала усяго каля двухсот гледачоў, але яны засталіся задаволеныя калі не гульнёй, то вынікам – безумоўна.

Можна, канешне, скептычна адносіцца да ўзроўню абласнога чэмпіянату. Але з пункту гледжання прафесійнага росту ігракі-дублёры "Камунальніка" паступова набываюць гульнявую практыку. Гэтыя спаборніцтвы маюць сэнс і, напэўна, цікавяць многіх футбольных заўзятараў. Таму "ГС" будзе ўважліва сачыць і за выступленнем "Камунальніка-2".

Валерый КАВАЛЕНКА

ДЗЯТЛАЎЧАНЕ Ў ЛІКУ ПРЫЗЁРАЎ

Нядаўна ў Маладзечанскім раёне Мінскай вобласці адбылося першынство рэспублікі па міні-футболу сярод выхаванцаў школ-інтэрнатаў.

Гонар Гродзенскай вобласці абараняла каманда Дзятлаўскай школы-інтэрната. Юныя футбалісты занялі 2-е месца. А лепшым іграком прызнаны Юрый Забалотны.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

"СЕРЕБРЯНАЯ" команда гребцов

На прошлой неделе в Минске прошли республиканские соревнования по гребле на байдарках и каноэ "Олимпийские дни молодежи". Команда Гродненской области, в составе которой было семеро слонимских гребцов, заняла 2-е место.

Удачно выступили наши ребята и в личном зачете. В старшей возрастной группе (1983-84 г.р.) в каноэ-одиночке на дистанции 1000м Андрей Дубина (УОР) был вторым, а Иван Григорчик (УОР) – четвертым. На дистанции же 500 м они заняли соответственно 6-е и 3-е места.

Среди спортсменов 1985-86 г.р. в эстафете 4х500 м на каноэ-одиночке третье место занял Владимир Маслов (СШ №8). А наиболее удачно выступили наши гребцы на байдарке. В одиночке на дистанции 500 м Дмитрий Коваленко (СШ №5) был третьим, а Дмитрий Лойко (СШ №5) – четвертым. В эстафете 4х500м участвовали сразу трое слонимских гребцов – Дм. Коваленко, Дм. Лойко и Константин Король (гимназия №1) – и заняли второе место.

В байдарке-двойке на 1000 м наш дуэт Дм. Лойко и Дм. Коваленко стал вторым, а на 500 м им и вовсе не было равных.

Валерий КОВАЛЕНКО


Фота Віталя Гіля

ЮНАРМЕЙЦЫ ПРОВЕЛИ СВОЮ ИГРУ

В воскресенье, 20 мая, игра "Зарница" получила второе рождение. Прошла она на территории 354 станции дальней радионавигации, которая в народе получила название "Вышки". В военизированных баталиях приняли участие 100 ребят из десяти школ города.

Соревнования начались с торжественного построения и знакомства с жизнью воинской части. Потом было прохождение строевым шагом с песней.

Основные же состязания развернулись в военно-спортивных видах. Ребята подтягивались на перекладине, бегали на 400 и 800 метров, метали на точность гранаты. Всего интересней была, конечно, эстафета, включавшая восемь этапов: бег на 50 метров, наложение шины, перенос раненого, пользование противогазом, бег со связанными ногами, пришивание пуговицы, бег с колесом и опять бег на 50 метров.

В завершение состоялся конкурс по выпуску боевого листка "Мы на "Зарнице"" и обед с солдатской кашей, которая пришлась по вкусу всем без исключения.

Хорошая организация игры позволила провести ее без накладок. В этом большая заслуга командования части и, в частности, начальника штаба майора Игоря Ремеза. Холодная ветреная погода не помешала весело провести день ребятам и их родителям, которые приехали поболеть за своих детей.

Победу одержала команда четвертой школы в составе Алексея Загорского, Натальи Кирик, Андрея Василюка, Юлии Ахромович, Юлии Мороз, Сергея Радевича, Ильи Рыжевича, Натальи Давыдик, Елены Маркушевской и Александра Савчица. Подготовили ребят к соревнованиям педагог-организатор Инна Мандрик и классный руководитель Инна Борисевич. На втором месте оказались юнармейцы СШ №3, а на третьем – СШ №1.

Валерий КОВАЛЕНКО

анекдоты

- Кукушка-кукушка, а накукуй мне 100 лет!
- А накукуй тебе столько?

Разговор мужа и жены:
- Слушай, что мы подарим на этот раз моей маме на день рождения?
- А что мы дарили в прошлый раз?
- В прошлый раз мы подарили ей стул.
- Ну а теперь подведем к нему электричество.

Приходит зять домой, снимает рубашку, поворачивается к теще спиной и говорит:
- Плюй!
- Да ты что, как же я буду на родного зятя плевать?!
- Я сказал - плюй!
- Но почему???
- Врач сказал, что от радикулита змеиный яд помогает.

Дама оборачивается к сидящему сзади нее в зале зрителю:
- Вам не мешает мое перо на шляпе?
- Нисколько! Я его отрезал и теперь все прекрасно вижу!

Начинающий автор приносит в театр свою пьесу.
- Я не могу допустить, чтобы в моем театре произносились неприличные слова!
- Но ведь в моей пьесе они отсутствуют.
- Зрители скажут...

Игроки "Коммунальника" поздравляют своего тренера с днем рождения.
- Лучшим подарком для меня будут ваши победы.
- Поздно. Мы уже купили вам галстук.

Два грабителя в магазине набивают чемоданы мужскими костюмами.
- Жак, смотри! - говорит один. - За этот костюм они дерут пятьсот франков! Это же настоящий грабеж!

Мужчина в обеих руках несет бутылки. Приятель его спрашивает:
- Ты что, тару несешь сдавать?
- Нет, с женой поругался, так она сказала: забирай свои вещи и уходи.

- Зачем же вы вызвали меня на свидание, если вы уже женаты?
- А зачем же вы, сударыня, пришли, если вы еще не замужем?

Прапорщик выстраивает новобранцев:
- Художники есть?
- Есть.
- Два шага вперед.
Выходят двое.
- Так вот, возьмите в каптерке пару топоров и нарисуйте-ка мне к ужину дровишек.

Возле пивного ларька:
- Мужики, не стыдно всю жизнь в пивнушке проводить? Сходили бы, что ли, в театр, в музей!
- Ни хрена, бабка, здоровье важнее!

Женщина в брачной конторе объясняет, какого мужа ей хотелось бы иметь:
- Он должен быть вежливым, иметь разносторонние интересы, любить животных, рассказывать мне всякие забавные истории, разъяснять международную обстановку и никогда меня не перебивать.
- В таком случае вам нужен не муж, а телевизор.

Сидят две хорошо "подогретые" подруги. Одна:
- Ну, что, Валюха, покатили?
- Я не Валя. Я - Катя.
- ... Ну, что, Катюха, повалили?

сканворд

СОСТАВИЛ ВЛАДИМИР ВАШУТА

"Белые росы". Актёр. Великий русский писатель. Штат в США. Город в Польше. Тропический плод. Город-герой. Триумфальная... Город в Италии. Хоть в ..., хоть по лбу. Штат в США. Женское имя. Сыроежка. Вес упаковки. Часть лица. "Иногда я жду тебя". Разрушение. Сражение. Женское пальто. Река во Франции. Богиня радуги (греч. миф.). Войсковое подразделение. Каменный утёс. Мяч в воротах. Вечнозелёное дерево. У самолёта. Национальная японская борьба. Русский адвокат. Тайник. На болоте. Остров в Малайском архипелаге. Актёр театра "Христофор". Хищное животное. Характер. Размер, величина. На стройке. Популярность. Судьба, удача. Амплуа актёра. Периодическое издание. Один из "ментов". Покупка партиями. Плотная шерстяная ткань. В паспорте. Животное. Плакучая... Пьеса Островского. Для ногтей. Король, воспетый А.Пугачёвой. На дне водоёма. Роман Ф. М. Достоевского. Штат в США. Женское имя. Кормовое растение. Рассказ И.Бунина. Сорт яблок. Фа. Древнеримская монета. Серафим. Второй голос в музыкальной партии. Город в США. Нота. Предмет разговора. Город в Бельгии. Древнерусское украшение. Островерхая вершина горы. "Руслан и Людмила". Персонаж. Сильный клёв рыбы. Передача мяча. Река в Нидерландах. Фильм с участием Виктора Цоя. Город в Гане. Полуостров в Западной Сибири.

Разгадав сканворд и слово-пароль, вы узнаете страну, где была изобретена канцелярская скрепка

1	2	3	4	5	6	7	8

ОТВЕТЫ НА кроссворд (№20)

ПО ВЕРТИКАЛИ

1. Мол **2**. Сто **3**. Кру **4**. Поп **5**. Ортоцентр **7**. Блок **10**. Эр **11**. Страусник **12**. Орган **13**. Радар **15**. Ежа **16**. Скат **17**. Уайзмен **19**. Норка **23**. Урон **24**. Анис **26**. Обо **31**. Ля **32**. Га **34**. Льгота **35**. Плис **36**. Илот **39**. Жук **40**. Кунак **41**. Ра **42**. Львиный **43**. Гера **45**. Тир **49**. Троп **50**. Анжела **51**. Мехикали **52**. Бровар **53**. За **55**. Оратор **58**. Шер **61**. Акушер **62**. Аул **66**. Ария **68**. Оаху **72**. Яга **74**. Ос **75**. Ас **76**. Иа

ПО ГОРИЗОНТАЛИ

6. Онтарио **8**. Орёл **9**. Пеле **14**. Оператор **16**. Склад **18**. Епанча **20**. Ара **21**. Накал **22**. Ту **25**. Террасы **27**. Озон **28**. Блоха **29**. Ио **30**. Фламинго **33**. Зевс **36**. Ил **37**. Лье **38**. Уж **42**. Ли **44**. Узурпировать **46**. Поле **47**. Ива **48**. Наст **51**. Мири **52**. Базар **54**. Нар **56**. Моджахеды **57**. Ош **59**. Корм **60**. Веа **63**. Плектр **64**. Барка **65**. Тиун **67**. По **69**. Алтарь **70**. Ушу **71**. Ре **73**. Гав **77**. Фалестрис **78**. Ат **79**. Усач

СЛОВО — не воробей...

- В Штатах изобрели новую пулю, без гильзы, теперь к ней изобретают автомат.
- В этой части все офицеры служат самым наглым образом!
- В этом положении ни одна часть тела не должна привлекать внимание потенциального противника!
- Вакуумную бомбу впервые применили израильтяне против вьетнамцев.
- Вам бы все булочки, девочки, да сметана!
- Вам звонок звенит в самое неподходящее место.
- Вам уже скоро студенты будут показывать где, что и куда делать.
- Вам что здесь, на блюдечке поднести, чтобы это тут на подносе было?
- Вам это может быть интересно, вы с этим никогда не встретитесь.
- Ваш поступок — удар ниже пояса в спину перестройки!
- Ваша прическа требует повешения ее парикмахера.
- Ваше занятие гроша выеденного не стоит.
- Ваше собрание не стоит выеденных комсомольских групп.
- Ваши обязанности на оперативном дежурстве заключаются в четком и быстром маневрировании между ведром с водой, электрическим чайником и офицером.
- Вашингтон, Пентагон и другие страны НАТО.
- Ведите себя так, как будто вы культурные люди...
- Ведь у вас есть часы и они дают вам право определения времени.
- Взвод вышел на опушку деревьев.
- Взвод! Спиной друг к другу в шахматном порядке по диагонали становись!
- Взвод, сегодня субботник. Объясняю задачу: собрать все кирпичи и сжечь.
- Внешний вид проверили? Воротнички, ремни, портянки правильно намотаны?
- Водка пахнет не спиртом, а гауптвахтой.
- Во взводе всегда есть запасной водитель: машина сломается или еще что-нибудь.

ГОРОСКОП от www.ignio.com НА НЕДЕЛЮ

ОВЕН

Неделя благоприятна для новых дел и начинаний. Ваша общительность может принести хорошие результаты, т.к. новые связи и знакомства могут улучшить Ваше материальное положение. На работе начальство будет довольно вашими достижениями. Постарайтесь не упустить интересное деловое предложение, и у Вас появится шанс расширить свое дело и обрести новых надежных партнеров.

ТЕЛЕЦ

На этой неделе у Вас появится шанс подключиться к творческому процессу. Перед Вами могут открыться новые перспективы. Многие недоразумения и неурядицы остались в прошлом, будут налаживаться отношения с коллегами по работе, друзьями, окружающими. Тайные враги, если они имеются, могут высветиться, сделав оплошность.

БЛИЗНЕЦЫ

Вот и наступило Ваше звездное время, когда строят новые планы, возникают новые надежды, открывается творческий потенциал. Вы почувствуете, как прибывают Ваши силы, и уверенность вновь сопутствует Вам.

РАК

Настало время подведения итогов и завершения некоторых долгосрочных дел. Постарайтесь решить все разногласия тихо и, по возможности, мирным путем. Ни в коем случае не оскорбляйте друг друга, т.к. Вы можете обрести тайных врагов, и это нанесет урон Вашему авторитету.

ЛЕВ

У Вас может появиться интересная идея, и Вы сможете рассчитывать на помощь друзей в ее реализации. Вам необходимо собраться с силами и принять важное решение, которое повлияет на Вашу дальнейшую судьбу. Возможно, Вы поменяете вид деятельности, что принесет Вам улучшение материального положения.

ДЕВА

Неделя динамична и разнообразна. Постарайтесь не посвящать почти все свое время работе, распланируйте свою неделю с учетом личной жизни. Начинается полоса везения. Вас будут поддерживать не только друзья, но и в какой-то мере оппоненты. Свойственное Вам упорство и трудолюбие воспримут на работе положительно, что позволит Вам сделать еще один шаг в Вашей карьере.

ВЕСЫ

На этой неделе Вы можете стать популярной личностью, Вы будете в центре событий. О Вас будут рассказывать, на Вас будут обращать внимание, некоторые даже попытаются перенять Ваш стиль и манеру одеваться. Открываются новые перспективы и возможности, как в работе, так и в творчестве.

СКОРПИОН

Наступает благоприятная неделя для творчества и изобретений. Правда, Вам необходимо объективно оценить собственные способности и возможности, а еще важно учитывать накопившуюся усталость. В понедельник желательно ничего нового не предпринимать. Постарайтесь поддержать родственников в трудную минуту.

СТРЕЛЕЦ

На этой неделе постарайтесь быть выдержанным и благоразумным, не позволяйте втянуть себя в авантюру. Ваши идеи и начинания будут поддержаны окружающими. Возможно, на этой неделе придет информация, которая приведет к зарубежной поездке. Вторая половина недели может быть посвящена поездкам, деловым встречам и переговорам.

КОЗЕРОГ

Хорошая неделя для доделывания незавершенного - время, когда можно наверстать упущенное. В Ваших силах изменить в лучшую сторону отношения с окружающими. В понедельник и пятницу лучше не вступать в споры, они не принесут ничего конструктивного. В субботу могут возникнуть проблемы, связанные с работой.

ВОДОЛЕЙ

Хорошее время для реализации лучших черт Вашего характера и Ваших способностей. Вам необходимо сконцентрировать свое внимание на поставленных целях. Поддерживайте хорошие отношения с коллегами по работе, от этого могут зависеть Ваши успехи на трудовом поприще. В субботу лучше не вступать в споры с домашними, этим Вы только осложните отношения.

РЫБЫ

Постарайтесь усмирить свои амбиции, иначе Ваш авторитет может оказаться под угрозой. Вам необходимо проверять поступающую информацию. Сейчас не время отстраняться от действительности и уходить в мир иллюзий. Вам стоит сменить свою сентиментальность на заботливость и защищенность. В среду Вас могут порадовать новыми, перспективными деловыми предложениями. Задумайтесь над сменой имиджа.

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.97г.
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Генадзь БАБОШКІН, Віктар ВАЛАДАШЧУК, Раміз МАМЕДАЎ
ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР Віктар ВАЛАДАШЧУК
Адрас рэдакцыі: 231800, г.Слонім, вул. Я.Купалы, 5.
Тэлефоны: рэдакцыі 2-14-39
..........(017)210-87-17
аддзел рэкламы 2-49-39
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.
Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць. Рэдакцыя таксама не адказвае за змест рэкламы.
Падпісана да друку 23 траўня 2001г. Час падпісання 7:00.
Надрукавана ў Гродзенскім абласным унітарным прадпрыемстве "Слонімская друкарня", г.Слонім, вул. Хлюпіна, 16.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.
Падпісныя індэксы: 64042 (індывідуальная) 63818 (ведамасная) 63646 (льготная)
Наклад 10.200 экз.
Заказ № 1792
E-MAIL: gs@irex.minsk.by HTTP://gs.promedia.minsk.by ПЭЙДЖЭР: 8-22-730000 аб. 95196